***Аляксандр Карацееў***

**ДЫСЦЫПЛІНА «МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКЫВАМ» ЯК НЕАБХОДНАЯ ЧАСТКА ПРАЦЭСУ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКАНАЎЦАЎ НА ТРАДЫЦЫЙНЫХ ДУХАВЫХ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАХ БЕЛАРУСАЎ**

***Aliaksandr Karatseeu***

**DISCIPLINE «METHODS OF WORKING WITH FOLK GROUP» AS NECESSARY PART OF THE PREPARATION PROCESS OF TRADITIONAL PERFORMERS ON WIND BELARUSIAN INSTRUMENTS**

*У артыкуле даследуюцца асноўныя ўмовы вывучэння і роля дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на традыцыйных духавых музычных інструментах беларусаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.*

*The article investigates the basic conditions of learning and the role of discipline «Methods of working with folk group» in the process of preparing the performers on Belarusian traditional wind instruments in Belarusian State University of Culture and Arts.*

На сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі вяртанне да яе вытокаў – заканамерны працэс. Вплеск на мяжы XX-XXI стст. інтарэсу да гісторыі, акалічнасцей колішняга бытавання і сучаснага адраджэння традыцыйных духавых музычных інструментах беларусаў – яскравае таму сведчанне. У гісторыі народнай культуры Беларусі гэтыя інструменты, у першую чаргу, былі запатрабаваныя ў сольнай выканальніцкай практыцы, але затым музыкі, якія валодалі гэтымі інструментамі, актыўна далучыліся і да такіх выканальніцкіх формаў, як ансамблевае, капэльнае і аркестравае выканальніцтва. У сучаснай сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі найбольш прывабным, актуальным і нават праблемным пытаннем з'яўляецца падрыхтоўка выканаўцаў на традыцыйных народных духавых і ударных інструментах беларусаў. Гэтая справа на сённяшні дзень паспяхова вырашаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Аналіз спецыяльнай літаратуры і іншых крыніц па праблемах народна-інструментальнага выканальніцтва з удзелам духавых інструментаў, сведчыць, што сярод розных прац гэтага кірунку вызываюць цікавасць даследаванні І. Благавешчанскага [4, с. 103 – 104], А. Крамко [15], І. Назінай [16], польскіх фалькларыстаў К. Машынскага [17], Ч. Пяткевіча [18], а таксама працы іншых даследчыкаў [1, с. 72-76; 2, с. 68-71] і матэрыялы, якія ўвайшлі ў публікацыі аўтара гэтага артыкула [19 – 14]. Гэтыя публікацыі дазваляюць атрымаць некаторае ўражанне аб значнасці засваення пытанняў неабходнасці вывучэння традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў як ў культурна-гістарычным, так і ў адукацыйна-практычным і творча-асветніцкім аспектах. Нягледзячы на багатую гісторыю існавання, эвалюцыю і справы папулярызацыі гэтых інструментаў, відавочна, што ў маштабах рэспублікі неабходна ў навучальных установах розных узроўняў, тыпаў і відаў ажыццяўляць мэтанакіраваны працэс падрыхтоўкі выканаўцаў на традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах у розных выканальнікіх формах: 1) сольнае; 2) ансамблевае; 3) капэльнае; 4) аркестравае. Прыкметнай падзеяй трэба адзначыць выданне фундаментальнай «Школы ігры на беларускіх народных духавых інструментах» [10, с. 119-122; 7], працы знакамітага і апантаннага даследыка і творцы музычнага фальклору бацькаўшчыны У. Грома [5; 6], якія дазваляюць сёння рыхтаваць выканаўцаў на народных духавых інструментах і якія здольны рэалізаваць мастацкі патэнцыял традыцыйных народных духавых і ўдарных інструментаў беларусаў у розных ансамблях, капэлах, аркестрах. Але актуальным пытаннем працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў на традыцыйных народных духавых і ударных інструментах беларусаў з'яўляюцца не толькі іх творча-выканальніцкія здольнасці, але і фарміраванне гэтых спецыялістаў і як кіраўнікоў творчых калектываў. З мэтай вырашэння асноўных напрамкаў гэтага працэсу намі была распрацавана праграма дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» [8].

Адначым, што дысцыпліна «МРФК» (далей у тэксце артыкула – дысцыпліна «МРФК») з'яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для музычнага мастацтва, у тым ліку яго разнавіднасці – духавога мастацтва. Вывучэнне мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей народных духавых і ўдарных інструментаў на лепшых узорах нацыянальнай музычнай спадчыны і сусветнага музычнага мастацтва павінна спрыяць фарміраванню ў студэнтаў разглядаемай спецыяльнасці дакладных ведаў аб функцыянаванні гэтых інструментаў, творчых калектываў, у якія ўваходзяць народныя духавыя і ударныя інструменты. Засваенне тэарэтычнага і практычнага матэрыялу вычэбнай дысцыпліны «МРФК» дазволіць будучым канцэртным выканаўцам, артыстам ансамбляў, аркестраў самастойна арганізоўваць творча-выканальніцкую ці педагагічную дзейнасць, дакладна вывучаць і чытаць аркестравыя партытуры, развіваць асабістыя навыкі, уменні па кіраўніцтве дзейнасцю адпаведнага складу аркестра, капэлы ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць.

Усведамленне студэнтамі тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па дысцыпліне «МРФК» цесна звязана з адпаведнымі ведамі па музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплінах: «Гісторыя мастацтваў», «Сальфеджыа і тэорыя музыкі (гармонія, паліфонія, аналіз музычных формаў)», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Народна-ансамблевае выканальніцтва», «Методыка выкладання дысцыплін», «Чытанне аркестравых партытур» і г.д. Таму мэта працэсу навучання па гэтай дысцыпліне – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны ажыццяўляць творча-выканальніцкую дзейнасць і як саліст-выканаўца, і як артыст таго ці іншага складу аркестра, капэлы ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна вырашаць арганізацыйныя, метадычныя і мастацка-творчыя пытанні.

Падчас вывучэння дысцыпліны «МРФК» студэнты павінны атрымаць тэарэтычныя і практычныя веды па методыцы работы з фальклорным калектывам, ведаць тыпалогію гэтых калектываў, удасканаліць асабістыя навыкі па састаўленні плану работы з адпаведнымі фальклорнымі мастацкімі калектывамі ў галіне нацыянальнай мастацкай культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая ўключае наступныя пытанні: a) падбіранне партытур для розных саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў з мэтай эфектыўнай арганізацыі рэпетыцыйных заняткаў з іх удзельнікамі; b) дакладнага афармлення зместу розных планаў работы з калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр); c) дакладных ведаў аб сутнасці розных тыпаў агульна-калектыўных рэпетыцый з фальклорнымі калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр); d) аптымальнае вызначэнне партытур для розных саставаў ансамбляў, капэл, аркестраў народных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі арганізацыі сацыякультурнай, музычна-асветніцкай і музычна-эстэтычнай дзейнасццю мастацкага калектыву (ансамбль, капэла, аркестр); e) расшыфроўкі існуючай спецыяльнай тэрміналогіі па методыцы работы з фальклорным калектывам (ансамбль, капэла, аркестр).

Падчас засваення матэрыялаў дысцыпліны «МРФК» студэнты павінны атрымаць веды па такіх пытаннях, як: 1) класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр); 2) сутнасць аркестрава-ансамблевага выканаўства і вызначэнне адпаведных задач пры выкананні музычных твораў; 3) мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па напісанні партытур для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр); 4) этапы работы над музычнымі творамі, іх змест і задачы; 5) выкананне розных тэматычных груп музычных твораў падчас працэсу фарміравання рэпертуару для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр); 6) функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці народных духавых і ўдарных інструментаў і спецыфіка іх выкарыстання ў фальклорных калектывах (ансамбль, капэла, аркестр); 7) сутнасць аркестрава-ансамблевай падрыхтоўкі падчас арганізацыі агульна-аркестравай рэпетыцыі; 8) сацыякультурныя аспекты, асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў народных духавых і ўдарных інструментаў і выкарыстанне разнастайнасці мастацка-тэматычных груп музычных твораў з улікам сацыяльнай і ўзроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма.

Акрамя таго, студэнты падчас вывучэння матэрыялаў дысцыпліны «МРФК» павінны сфарміраваць і неабходныя асабістыя ўменні: a) напісанне розных варыянтаў плану работы з вызначаным саставам фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр); b) вызначэнне розных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў для розных саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр); c) вызначэнне розных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў для ансамбля аркестравых груп у межах фальклорнага калектыву; d) вырашэнне пытанняў па выкананні аркестравых (ансамблевых) цяжкасцей для ўдзельнікаў той ці іншай інструментальнай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнага матэрыялу; e) аналітычная работа падчас вызначэння партытур для падрыхтоўкі музычных твораў; f) практычная работа падчас вызначэння партытур і правядзення рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр) з мэтай вызначэння асобных фрагментаў меладычнага галасавядзення, кантрапункту, умова адпаведнага транспаніравання і неабходнай змены тэсітуры гучання музычнага твора, улік жанрава-стылёвых асаблівасцей пры выкананні ансамблем, капэлай ці аркестрам, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

Пры выкладанні матэрыялаў па дысцыпліне «МРФК» неабходна выкарыстоўваць наступныя сучасныя педагагічныя тэхналогіі: 1) тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; 2) тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; 3) камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, дэбаты і інш.); 4) гульнёвыя тэхналогія (дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні).

З мэтай фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ВНУ мэтазгодна выкарыстоўваць рэйтынгавую і крэдытна-модульную сістэмы ацэнкі вучэбнай, вучэбна-даследчай і самастойнай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў.

На наш погляд, аптымальным падыходам да арганізацыі працэсу навучання па дысцыпліне «МРФК» можа выступаць наступны прыкладны тэматычны план (таб. 1).

Табліца 1 – прыкладны тэматычны план па дысцыпліне «МРФК»

| № п/п | Н А З В А Т Э М Ы | Колькасць аўд. гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | семін., практ. | усяго |
| . | ***Уводзіны.*** | 2 | | **2** |
| | **Раздзел I.** ***Гісторыя развіцця фальклорных аркестраў, капэл, ансамбляў.*** | | | **16** |
| Тэма 1. | Гісторыя развіцця ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (у кантэксце сусветнай музычнай культуры). | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 2. | Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці фальклорных калектываў, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты. | 8 | 3 | 11 |
| | **Раздзел II.** ***Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.*** | | | **23** |
| Тэма 3. | Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву. (дзве лекцыі ў 2 семестры!) | 10 | 1 | 11 |
| Тэма 4. | Асаблівасці інтанавання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 5. | Сутнасць рэпетыцыйнай работы з інструментамі, якія транспануюць | 6 | 1 | 7 |
| | **Раздзел III.** ***Творча-практычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.*** | | | **37** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 6. | Сутнасць работы з групай народных лабіяльных інструментаў у працэсе рэпетыцыйнай работы з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 7. | Сутнасць работы з групай народных язычковых інструментаў у працэсе рэпетыцыйнай работы з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам | 2 | | 2 |
| Тэма 8. | Работа з фальклорным ансамблем, капэлай, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты | 8 | 1 | 9 |
| Тэма 9. | Правядзенне асноўных тыпаў рэпетыцый | 10 | 1 | 11 |
| Тэма 10. | Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў і яе арганізацыя | 8 | 2 | 10 |
| | ***УСЯГО:*** | ***66*** | ***12*** | ***78*** |

Важным пытаннем і ўмовай засваення ведаў па дысцыпліне «МРФК» з'яўляецца вызначэнне студэнтамі асаблівасцей паліфункцыянальных службовых абавязкаў кіраўніка фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты. Яны павінны ведаць, што кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра, – гэта ініцыятыўны арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву. Ён павінен вырашаць складаныя праблемы па арганізацыі фальклорных ансамбляў, капэл ці аркестраў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты. У гэтым кірунку ён павінен ведаць гісторыю эвалюцыі розных складаў ансамбляў, аркестраў, метады даследавання (арганалагічны, музычна-эстэтычны). А для вырашэння мастацка-творчых пытанняў неабходна вызначыць аптымальныя мэты, задачы і формы музычна-тэарэтычнай падрыхтоўкі і эстэтычнага выхавання ўдзельнікаў фальклорнага ансамбла, капэлы ці аркестра, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.

Наступнай умовай засваення ведаў па дысцыпліне «МРФК» з'яўляецца вызначэнне студэнтамі тых тыпавых выканальніцкіх формаў, у якіх выкарыстоўваюцца духавыя і ўдарныя інструменты. Акрамя гэтага неабходна ведаць і аб спецыфіцы ўключэння духавых і ўдарных інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку на ўзроўні сольнага, ансамблевага, капэльнага і аркестравага выканальніцтва. І ў гэтым кірунку немагчыма не ведаць сацыякультурыя асаблівасці сучаснай творчай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл і аркестраў з удзелам традыцыйных народных духавых і ўдарных інструментаў беларусаў.

З мэтай ажыццяўлення арганізацыйнай і метадычнай работы ў фальклорным калектыве будучыя іх кіраўнікі павінны вызначаць тыпалогію, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці правядзення асноўных відаў рэпетыцыйных заняткаў з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам, якія ўключаюць традыцыйныя народныя духавыя і ўдарныя інструменты: ардынарная, карэктурная, прагонная, генеральная рэпетыцыі. Гэта будзе спрыяць вызначэнню тыпалогіі, функцыянальнай, мастацка-выканальніцкай асаблівасці правядзення асноўных відаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці: дывертысментныя, тэматычныя, монатэматычныя, юбілейныя і іншыя разнастайнасці канцэртных выступленняў фальклорнага мастацкага калектыву, у складзе якога будуць традыцыйныя народныя духавыя і ўдарныя інструменты беларусаў.

Трэба адзначыць і такую неабходную ўмову засваення матэрыялаў дысцыпліны «МРФК», як вызначэнне будучымі кіраўнікамі фальклорных мастацкіх калектываў праблемы фарміравання рэпертуару і пошук шляхоў яе вырашэння.

Для атрымання дастатковых ведаў па дысцыпліне «МРФК» мы прапануем наступныя крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў (таб. 2).

Табліца 2 – Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне «МРФК»

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, з'яў, крытэрыяў і форм кантролю вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца музычна-педагагічнай кваліфікацыі і культуры выкладчыка ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення педагагічнага майстэрства ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці). Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, метадыцы работы з фальклорным калектывам. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля вучэбна-выхаваўчага працэсу па вывучэнні спецыфікі музычнага мастацтва; сістэмы музычнай адукацыі па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах; веданне асноўных форм і метадаў засваення музычнага мастацтва ў розных тыпах вучэбных устаноў і г.д.). Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, метадыцы работы з фальклорным калектывам. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дзейнасці фальклорных калектываў, падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах, раскрыццё праблем музычнай адукацыі ў сучасных умовах развіцця культуры. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных калектываў, выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне асабістых вывадаў канкрэтнымі прыкладамі з вопыту работы лепшых кіраўнікоў фальклорных калектываў, выкладчыкаў у розных тыпах вучэбных устаноў. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па спецыяльных дысцыплінах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дзейнасці кіраўнікоў фальклорных калектываў, падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Усведамленне студэнтам вучэбна-творчага і вучэбна-педагагічнага працэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў, асэнсаванне вопыту вядучых кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, спецыялістаў-выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць формы і метады арганізацыі творчага вучэбна-выхаваўчага прцэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах, карыстацца вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з фальклорным калектывам. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах. Глыбокае асэнсаванне праблем музычнага выхавання і навучання выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай вытворчай выканальніцкай дзейнасці кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах, аналізаваць праблемы, якія існуюць у практыцы навучальных устаноў. Кваліфікаванае карыстанне вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з фальклорным калектывам. Адсутнасць памылак. |

**Спіс літаратуры:**


1. Алефірэнка, В. Параўнальна-марфалагічны аналіз беларускай і польскай дуды / В. Алефірэнка // Музычная культура Беларусі : Пошукі і знаходкі : матэр. VII навук. чыт. памяці Л. С. Мухарынскай (1906 – 1987). – Мінск : Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 1998. – С. 72–76.
2. Антоневич, В. А. Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В. А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : Респ. межвед. сб. – Мінск : Вышэйш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.
3. Белорусские народные наигрыши / сост. и авт. вступ. ст. И. Д. Назина ; под общ. ред. В. Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12 с.
4. Благовещенский, И. П. К истории белорусской народной инструментальной музыки / И. П. Благовещенский // Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Минск, 1965. – С. 103–143.
5. Гром, У. М. Заіграйце, музыкі! : Рэпертуарны зборнік для фальклорных катектываў. – У 2-х ч. – Ч. 1. – Мінск : Чатыры чверці, 1998. – 111 с.
6. Гром, У. М. Заіграйце, музыкі! : Рэпертуарны зборнік для фальклорных катектываў. – У 2-х ч. – Ч. 2. – Мінск : Чатыры чверці, 1998. – 155 с.
7. Гром, У. М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Ч. 2. Ансамблевае выкананне : Вучэб.-метад. дапам. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 217 с.
8. Карацееў, А. Л. Методыка работы з фальклорным калектывам: вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06–11 «Духавыя інструменты (народныя)» / А. Л. Карацееў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 21 с.
9. Карацееў, А. Л. Народны духавы музычны інструментарый Беларусі як гістарычная сведка развіцця нацыянальнай культуры і яго месца ў сусветнай арганалогіі і арганафоніі / А. Л. Карацееў : зб. тэз. дакл. на навук.-метадыч. канф. праф.-выкл. скл. – Ч. 1. – Мінск : МІК, 1993. – С. 21-26.
10. Карацееў, А. Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А. Л. Карацееў // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.
11. Коротеев, А. Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев : IV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіееўскія чыт., прысв. Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 1998 г.). – У 2 ч. Ч. 2 / ЕГУ, БУК ; рэдкал. : Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) [і інш.]. – Минск : Бел. ун-т культуры, 1999. – С. 168–176.
12. Коротеев, А. Л. Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Україньска культура в іменах і дослідженнях. Навукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Віп. III – Рівне: Рівненський державний інститут культури, 1998. – С. 296–320.
13. Коротеев, А. Л Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

// «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. І. І. Сучкоў. – Минск : Бестпринт, 2004. – С. 87–94.
14. Коротеев. А. Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев : Х Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чыт., прысв. Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2004 г.) / рэдкал. : М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.
15. Крамко, А. Я. Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам. / А. Я. Крамко – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
16. Назіна, І. Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.
17. Moszynski, K. Polesie Wscodnie. Materijaly etnograficzhne z wscodniego czessci b. Powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego. – Warzawa, 1928. – 304 s.
18. Pietkiewicz, Cz. Polesie Rzecsyckie. Cz. 2. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego: Materijaly etnograficzhne. – Warzawa, 1938. – 459 s.

*Алег Аляхновіч*

## НЕКАТОРЫЯ МЕРКАВАННІ АДНОСНА ВЫКАРЫСТАННЯ МУЗЫКІ Ў ТЭАТРАЛІЗАВАНЫМ ПРАДСТАЎЛЕННІ

*Aleh Alyahnovich*

## SOME OPINIONS ON THE USE OF MUSIC IN THEATRICAL PERFORMANCE

*Даследуецца спецыфіка музычнай падрыхтоўкі рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў. Раскрываецца важны аспект іх прафесійнай кампетэнцыі – аналіз музычных твораў, яго стылі і жанры, методыка вывучэння.*

*In the article the author explores the musical training of directors of theatrical performances. The author reveals such aspects of their professional competence as: the analysis of musical works, styles and genres of music, methods of studying music.*

Тэатралізаванае прадстаўленне – від відовішчнага мастацтва, форма забаўляльнай культуры, у якім сродкамі тэатру адлюстроўваюцца важныя жыццёвыя з'явы, факты і ідэі. Да яго адносяць агітацыйна-мастацкае прадстаўленне, літаратурна-музычную кампазіцыю, тэатралізаваны канцэрт, масавую тэатралізаваную ўрачыстасць і сучаснае мастацка-спартыўнае свята.

Вызначальнай рысай тэатралізаванага прадстаўлення з'яўляецца кампазіцыйная пабудова (уступ, развіццё дзеяння, вырашальны момант, фінал), якая адрозніваецца ад зместу тэатральнай п'есы адсутнасцю развіцця з'яў, звязаных паміж сабой прычынна-выніковымі адносінамі. Як правіла, ў кожным тэатралізаваным прадстаўленні рэжысёрамі выкарыстоўваецца музыка як выразны сродак. Многія даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што музыка прысутнічала ў старажытным абрадавым хоры як элемент «драматычнага роду» (В. Гусеў), у народным тэатры, выкарыстоўваецца ў розных жанрах сучаснай драматургіі.

У тэатралізаваным прадстаўленні музыка выкарыстоўваецца ў трох іпастасях – як выразны сродак, як структурны кампанент, як пэўны фон для развіцця дзеяння. Як мастацка-выразны сродак яна ўзбагачае выканаўчую палітру сродкаў і магчымасцей рэжысёра, не атрымліваючы пры гэтым самастойнага значэння ў тэатралізаваным прадстаўленні. З'яўляючыся структурным кампанентам рэжысёрскай пастаноўкі, музыка разам з літаратурным тэкстам становіцца часткай дзейснай структуры кожнага фрагмента прадстаўлення, а значыць і драматычным элементам апошняга.

Кожнае тэатралізаванае прадстаўленне мае сваю спецыфіку і патрабуе пэўнага музычнага вырашэння. Часцей за ўсё, нягледзячы на іх жанравую разнастайнасць і розныя ўмовы выкарыстання музыкі ў тэатральным дзеянні, рэжысёры ўзнаўляюць яе як музычны пралог, антракт, музыку ў развіцці дзеяння, фінал, эпізод, нумар.

Многія практыкі і даследчыкі тэатралізаваных прадстаўленняў у наш час адзначаюць, што ў сферы нацыянальнай культуры адбываецца ўхіл у асноўным у забаву, ажыццяўляецца дэфармацыя яе форм. Забаўкі маюць часам грубы і вульгарны кірунак, губляюць творчы пачатак, заснаваны на прынцыпах саперніцтва і меркантыльнасці, не выконваюць функцыю духоўнага развіцця асобы.

Павысіць узровень якасці забаўляльнай культуры немагчыма без пе¬ра¬асэнсавання прынцыпаў і метадаў прафесійнай падрыхтоўкі кадраў, у тым ліку і такіх як рэжысёры тэатралізаваных прадстаўленняў. Таму пры пад¬рых¬тоўцы будучых рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў неабход¬на рас¬пра¬цаваць тэорыю і методыку ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі студэнтаў, якія будуць здольныя да арганізацыі разнастайных форм нацыя¬нальнай культуры на высокім мастацкім узроўні. Ажыццявіць гэту высока¬род¬ную справу немагчыма без авалодання рэжысёрамі асновамі музычнага мастацтва. Музыка, як адзначалі У. Меерхольд, В. Няміровіч-Данчанка, К. Станіслаўскі і інш., з'яўляецца важным элементам драматургіі тэатра і ад¬ным са сродкаў удасканальвання тэатралізаваных прадстаўленняў (І. Шароеў).

На аснове вывучэння літаратуры па праблеме выкарыстання музыкі рэжысёрамі тэатралізаваных прадстаўленняў і асабістага шматгадовага вопыту работы ў якасці музыканта і выкладчыка дысцыпліцы «Музычна-шумавое вырашэнне свята», аўтар пераканаўся ў тым, што далейшае ўдасканаленне музычнай падрыхтоўкі адзначаных спецыялістаў магчымае пры ўмове спецыяльнай арганізацыі музычна-адукацыйнай, музычна-акцёрскай і музычна-рэжысёрскай дзейнасці студэнтаў. Пры гэтым важна, каб узровень музычнай падрыхтоўкі студэнтаў адпавядаў узроўню іх музычнай дзейнасці як рэжысёраў. Музычная падрыхтоўка павінна адбывацца ва ўмовах не толькі паралельнага, але і адначасовага вывучэння прадметаў спецыялізацыі («Рэжысура і майстэрства акцёра», «Моўнае дзеянне», «Музыка ў тэатралізаваным прадстаўленні», «Харэаграфія» і інш.).

Арганізацыя працэсу музычна-адукацыйнай, музычна-акцёрскай і музычна-рэжысёрскай вучэбнай дзейнасці на сінтэзе мастацтваў, патрабуе распрацоўкі і выкарыстання спецыяльнай методыкі, у якой павінна быць адлюстравана спецыфіка дзейнасці рэжысёра дадзенай спецыялізацыі. Яна абумоўліваецца сінтэзам музыкі, слова, руху і інш., якія заўсёды ўзнаўляецца ў адзінстве розных жанраў у тэатралізаваным прадстаўленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ